**прэзентацыя**

# Жыццё літары

**На старонках альбома «ЛітАрт. Знакі беларускага алфавіта», прэзентацыя якога нядаўна прайшла ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, прадстаўлены навуковыя артыкулы і мастацтвазнаўчыя аналітычныя развагі, а галоўнае — паўнацэнная экспазіцыя майстроў: ад знакаў Францыска Скарыны да сучасных лагатыпаў кампаній і арт-плакатаў.**




Альбом прысвечаны айчыннаму мастацтву шрыфтоў і ўяўляе сабой візуальную энцыклапедыю шрыфту як кода ідэнтычнасці беларусаў. Мастацтвазнаўцы сабралі ў кнізе падрабязную біяграфію аб'яднання «ЛітАрт» — ужо дваццаць гадоў яно праектуе шрыфты і ўводзіць каліграфію ў ранг вядучых мастацтваў краіны. Так паўстала ўнікальная нацыянальная школа графікі і шрыфту, заснаваная на традыцыях выданняў нашага першадрукара, а таксама напрацоўках авангарднага мастацтва XX стагоддзя.

Дзяліліся ўражаннямі і распавядалі аб падрыхтоўцы выдання на літаратурнай імпрэзе заснавальнік і куратар аб'яднання «ЛітАрт», каліграф, прафесар Павел Семчанка, мастацтвазнаўца, першы намеснік старшыні Саюза мастакоў Беларусі Наталля Шаранговіч, мастак, каліграф, дацэнт кафедры графічнага дызайну Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Генадзь Мацур, а таксама вядучы спецыяліст выдавецтва «Беларусь» (пад дахам якога альбом пабачыў свет) Анжэла Садоўская. Было адзначана, што жыццё літары ў агульнай плыні гісторыі — як міг. Літара не з'яўляецца раз і назаўсёды застылай формай: як і чалавек, жыве, змяняецца, развіваецца. Таму не выключана, што праз нейкі час у нашым алфавіце з'явяцца новыя — тыя, што адным знакам будуць перадаваць, напрыклад, гукі «дж» і «дз».

**Марыя ЯРАШЭВІЧ**